Беларускі шлях

ярэс рэдакцыі і адміністрацыі:
пухоуская вул. д. № 12

кцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
ніграцыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

кцыя пакідае за сабой права на-
янь перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[illegible]
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

34. Менск. Пятніца 3 мая 1918 г. Год I

Менск 3-г.

Інтэлігэнцыя і народ.

сійскія газэты бядуюць, у Большэвізіі інтэлігэн- зусім адкінута на бок на- ымі массамі. Такім чынам рэгулятора у дзержаунымі ыяльным жыцці Вяліка- і дзеля гэтаго доля ея ыцца экапамічным і па- ным крахам, каторы пры- ць с сабой беднасьць і са- злую рэакцыю.

дзін толькі біскуп Андрэй не быццам ходзіць па усе навіцкія мітынгі і крыты- ь іх работу. Дэмагогі па- ры вароду вядуць з ім ты і вельмі дзіуна, што інчэ ні арыштавалі. Гэта сю Расію адзін прыклад.

сюды мітынгуюць і усе со- ізуець без утрымку, —як ау нідауно народнік М. і, —«пьяненькі і подленькі оускі народ, с каторага ін- энцыя і славянафілы ра- нейкае божаство».

ярнемся да Беларусі. Калі уся нацыянальны белару- рух наміж шырокіх массау ду, то усе зьезды бела- у-воіноу складываліся с ат-селян і жменькі інтэлі- цу. Цікава нагладзець рэ- ацыі іх. Палавіна каждай люцыі зьездоу усіх фрон- армiяу, корпусау і др. зай- ь нажадання беларускаго эрсітэту, звароту эвакуіра- ых у Расію вучэльняу мін- о вучыцельскаго інстытуту. зарыі, гімназыі, местовых з, музэяу, старын. архівау д Зьезд у Несвіжы ух- у узяць над апеку Нес- кае замчышчо з яго гіста- ымі архівамі і бібліятэкай. акіх культурных пастановау было на зьездах другіх на- у Расіі.

Краевай культурай цікаві- я шэрая беларуская масса, кой каханне да сваей ні- снай бацькаушчыны ась- ляю душу і сэрца, падымаю- я да высаты ідэйн. інтэлігэнта. Ні забывайце, што на усе- арускім конгрэсе з 1700 авек чуць набрауся дзеся- людзей с вышэйшай аду- ыяй.

На правінцыі па валасьцех цяпер пачынаецца будова нормальнаго парадку. Селяне усю- ды мобілізавалі правінцыяльную інтэлігэнцыю і з весак і два- роу. Такі край ні прападзець. Цэнтры нашыя павінны браць прыклад з валасьцеу, дзеля вышэйшаго парадку працы па арганізацыі і адраджэння краю.

На мейсцы сіл беларускіх німнога; яны разсыпаны па усей былшай імпэрыі. Трэба часу, каб іх сабраць. Астаушымся тут сілам зашмат працы. Момэнт важны і адпаведальнасьць вялікая, але воля варункау уложыла іх на нашыя сабыя плечы. Мы павінны с помачаю акупацыйных уласьцей і усіх нашых шчырых прыхільнікау з другіх нацыяу зрабіць усе, што вымагаюць ад нас інтарэсы краю і народу.

Цяпер ідзець будаванне асвоу жыцця для многіх пакаленнау.

На беларускім шляху.

Тры гады працы Беларускага Камітэту.

У Вільні 29 красавіка мінулі тры гады ад зацьверджэння статуту Беларускаго Т-ва помачы пацярпеушым ад вайны. Таварыство заснавалося ў той момэнт, калі, ваенная навальніца дакацілася і да зямлі Беларускай, і ў Вільню і іншыя месты Беларусі хлынулі хвалі беларускіх уцекачоў з Гродзеншчыны і іншых мейсцаў. З вялікім трудом віленскім беларускім дзеячам удалося дастаць пазваленне на адкрыцце Т-ва ад расійскіх уласьцей, каторыя заўсёды адносіліся да беларусаў вельмі ніпрыхільна. І гэта ніпрыхільнасць ярка выявілася ў далейшых адносінах ураду да працы Беларускаго Т-ва: пад той час, як літвіном, паляком і жыдом «Татіянінскій Камітэт» даваў мільёны на помач уцекачом іх нацыянальнасьцяў, беларусам да самаго момэнту прыходу ў Вільню немцаў дадзено было ўсяго... 360 рублёў!

Усю работу дзеля помачы беларускім уцекачом вёў выбраны Т-вам Камітэт, зложэны сперша з 9 асоб. Камітэт заняўся організацией па ўсей Беларусі аддзелаў Т-ва, каб на месцох аказываць помач уцекачом. За чатыры месяцы працы былі адкрыты да 10 аддзелаў на правінцыі у Віленскай, Гродзенскай, Вітебскай і Менскай губ. Многа сот уцекачоў атрымало помач і ў Вільні, дзе камітэт адкрыў прытулак на Ласёўцы для прыежджаючых у Вільню адкуль яны разсылаліся у глыб Беларусі.

Пры эвакуацыі Вільні расійцамі значная часць членау камітэту была прымушэна пакінуць сталіцу краю. У Вільні асталася толькі малая жменя людзей—без грошы, без ніякіх запасаў, каторыя, адзнак ні кінулі работы. Камітэт стаўся цэнтрам усяго беларускаго жыцця у Вільні і, паагул, у межах окупацыі. З вялізарным напружэннем сваіх сіл Камітэту ўжо ў канцы 1915 году —праз тры месяцы пасьля адходу маскалёў—удалося наладзіць у Вільні першыя беларускія народныя школы і беларускіе вучыцельскіе курсы. Побач с помаччу уцекачом, большая часць каторых была скора эвакуована немцамі, давалася помач віленскай беларускай беднаце паагул— без розніцы рэлігіі: як каталіком, так і праваслаўным. Навука у школах была дармовая, ды апрыч таго дзецям выдаваліся дарма абеды, адзежа, чэравікі і інш. Школ сперш было 6 але с прычыны нідастачы грошы ў першай палавіне 1916 году чысло іх прышлося паменшыць да 5. Пры кожнай школі была свая страўня для дзяцей; пры дзьвех былі наладжэны майстэрні ручных работ і пры адной — сталярска-рэзьбярскі варштат.

Хаця Камітэт аказваў паводлуг магчымасьці помач усім патрабуючым у месьці і на правінцыі (высяленцам с фронту і інш.), адпак глаўнай задачай сваей ён паставіў помач матэрыяльную і духоўную беларускім дзецям. Трэба было ні толькі адзець, абуць і накарміць больш за 200 дзяцей, але і навучыць граматы, даць кніжку да навукі. У меру развіцця работы, камітэт ладзіў новые установы: гэтак у 1917 г. ў летку былі організованы два прытулкі для бедных дзяцей—у Чорным Боры (пад Вільняй) на летні час на 70 дзяцей і ў Качнох (пад Яшунамі) пастаўлены на 40 дзяцей.

З восені 1917 году чысло беларускіх школ у Вільні было паменшэно: дзеці с чатырох аднаклясовых школ былі злучэны у дзьве вышэйшаго тыпу, а адна—закрыта зусім. Гэта было вызвано тым, што 40 дзяцей было вывезено ў прытулак у Качанох, а каля 70 беларускіх дзяцей былі прыняты на пастаяннае жыццё ў прытулак нова-заснаванаго Т-ва «Золак».

Камітэт організаваў на выстаўцы віленскіх дамоў працы Беларускі Аддзел. Нізалежне ад таго, што тут прадаваліся работы беларускіх школьных майстэрняў і варштатаў, адкрыцце Аддзелу мае і шырэйшае значэнне: яно напамінае ўсім, што беларусы тут ёсць і робяць сваю культурна-нацыянальную работу.

У 1917 г. у Вільні адкрыты Камітэтам дзьве беларускія страўні: народная (св.-Юрскі пр. 22) і для сярэдняго стану (св.-Юрскі пр. 21). Беларуская народная страўня аказвае сур'ёзную матэрыяльную помач беларускай беднаце, даючы да 100 безплатных абедаў у дзень.

Да часу утварэння Беларускай Рады у Вільні, як найвышэйшай беларускай нацыянальнай установы ў межах окупацыі, Беларускі Камітэт выпаўняў функцыі нацыянальнаго цэнтру беларусаў: ён разам с камітэтамі іншых нацыянальнасьцяў выступаў у грамадзкіх справах перад нямецкімі ўласьцямі, прынімаў участце у розных агульных работах, організаваў выступленні у справе завядзення беларускай мовы ў касьцелі, пасылаў сваіх вучыцялёў у новаладжэные беларускіе школы (у Гродні, ў розных месцох па вёсках і т. д.), друкаваў школьныя падручнікі і т. п. Дзеля школьных спраў (укладанне праграм, організацыя школ і вучыцельскіх курсаў, падгатоўка падручнікаў) пры Камітэці была утворэна спэцыяльная школьная камісія.

Тое, што камітэт з на сьмех малымі грашмі здалеў развіваць гэткую шырокую работу, тлумачыцца тым, што ўсе члены яго працавалі зусім дарма, і утрыманне Камітэту нічога ні каштавало. Абароты Камітэту грашмі былі гэткіе: за час ад 15.X. 1915 да 22.VI. 1916 г.—7.994 м. 89 фэ[illegible] ад 22.VI. 1916 да 1.V[illegible] 1917—17,464 м. 85 ф.

У часе окупацыі Камітэт [illegible] перавыбран і складаецца [illegible] пер з гэткіх асоб: маршала[illegible] А. Луцкевіч, скарбнік — К. Мэнка, сэкрэтар—Я. Салавей, члены: І. Луцкевіч, А. Рачкоўская, Ф. Вішнеўскі і Я. Ліцкевіч.

Адрэс Камітэту: Віленская вуліца 33.

Дзіцячае сьвято у Вільні.

На св. Юра у Сьвята[illegible] касьцелі адбылася імша, [illegible] памыснае развіцце Т-ва «Зо[illegible] лак». Дзеці с прытулку Т-в[illegible] пеялі ў часі імшы па бел[illegible] руску песьні: «О, мой, Бо[illegible] веру Табе»...» «Увесь сьве[illegible] зямля і моро...» і «Вострабрамска Маці Божа...» Стройна адбіваліся мэлёдыйныя беларускія словы аб высокія сляпенні гэтаго старасьвецкаго касьцёлу. Пасьля імшы ушколі прытулку была устроена фэстына, на каторую сабралася горстка бліжэйшых да Т-ва асоб; дзеці дэклямавалі, сьпевалі, гулялі беларускіе гульні, і адыйгралі спэвічную штучку са спевамі «Перахітрылі» напісаную для дзіцячаго тэатру Станіславай Корфф. Пасьля прэдстаўлення для гасьцей дзеці паўтарылі ўсю праграму іншэ раз для дзяцей, і для запрошэных на гэту фэстыну бацькоў дзяцей. Міла было глядзець на дзяцей, каторые, прыбраўшыся ні толькі у сьвяточныя вопраткі, але і у сьвяточныя мінкі, [illegible]чыра пераняты, паказвалі чаго за віму навучыліся. А навучыліся-

...змат чаго: песьні і гульні выходзілі стройна і складна, прост абваражвалі душу шчыра народнымі беларускімі мэлёдзіямі і ладам. Штучку сцэнічную ігралі дзеці ні толькі с пераняццем, але з вялікім талентам. Болей жэ за ўсё радавало душу, што пад умелым кіраўніцтвам, дзеці на вачах вырастаюць на сьвядомых грамадзян, якіе ведаюць цэну і сваей роднай мове і сваей песьні. Запраўды вялікая заслуга перад нашай бацькаўшчынай усіх тых, хто прылажыў сваю пэглу да гэтай будоўлі. Чэсьць і падзяка ім належыцца і ад добрых людзей, і ад ба[illegible]аўскіх касьцей.

(«Гоман» № 35.)

Агульныя весткі.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ 29/IV Турэцкае войско узяло тэрыторыю на ўсход ад Карсу аж да граніцы.

БЭРЛІН 30/IV «Вольф». Фінляндская глаўная кватэра паведамляе, што Выборг ўзяты.

БЭРЛІН 29/IV «Вольф». Галяндзкі пасол барон Геверс зноў прыбыў у Бэрлін і меў бяседу у міністэрстве заграмічных справаў.

ВЕНА 29/IV. Атрымана вестка, што нямецкае войско [illegible]ходзіцца за 60 вёрст ад [illegible]астополю.

[illegible]ЕНА 29/IV. «Korr. Büro» [illegible]інскі пасол у Аўстрыі д-р. Якоўлеў учора прыбыў у [illegible]у.

БЭРЛІН 29/IV. «Вольф» перадае. «У часе свайго 5-ці тыднёвага наступленьня немцы узялі 4100 кв. кіл. тэрыторыі т. е. у 7 разоў болі чым Французы і Ангельцы у часе сваіх трох вялікіх наступлен[illegible], трываўшых 44 тыдні».

КЭНЭВА 29/IV «Lokal». [illegible] паведамлення акружаюч[illegible] [illegible]н. Фоша падкрэсьліваю[illegible] [illegible]то ангельскія пазыцыі кал[illegible] [illegible]у трэба разглядаць толькі часовыя, бо яны выстаўлены на цёнглы, страшны артылерыйскі абстрэл немцаў.

РОТТЭРДАМ 29/IV. Тутэйшыя газэты паведамляюць с Копэнгагі, што тамака за [illegible] дні ні атрымано с Пецербургу ні воднай тэлеграммы. Подлуг вестак с Фінляндзіі у Петраградзе пануе вялікае замешанне у зьвязку с контр-рэвалюцыяй.

ВАРШАВА 29/IV. Выборы у Раду Стану назначаны на 20 траўня (мая).

Весткі з Расіі.

Пецербург. 25 красавіка рада камісараў пeтраградскай камуны афіцыяльна паведаміла, што 24 красавіка белагвардзейцы запатрэбавалі здачы форта Іно з усімі запасамі харчоў і броні. Каманда форту ні згадзілася на здачу і белагвардзейсь далі [illegible] сроку 24 гадзіны каб абдумаць палажэнне.

З'явіўшыеся потым камісары Петраградскай камуны, заявілі белагвардзейцам, што здача форту Іно ні вымагаецца Берэсьцейскім трактатам, і што рускія ні за што яго ні аддадуць. У скутку перагавораў установлено на нейкі час заміранне.

Пецербурскія «Извѣстія», «Красная газета» і «Правда», ацэніваюць ваенную сытуацыю Петраграду надта трывожнай.

— Петраградская камуна выдала абавязк. пастанову, каб газэтная папера адпушчалася с фабрык і складаў толькі за дазваленнем сэкцыі друкарска-паперпай прамысловасьці і Рады Народн. гаспадаркі поўн. раёну.

— Гжатскі (смоленск. губ.) Совдеп« пастанавіў высяліць утіх памешчыкаў з іх маёнткаў за контр-рэволюцыйн. агітацыю. Такім чынам для аднэй часьці грамадзянства ўзнаўлена у соцыялістычнай рэспубліцэ ганебная «черта осѣдлости».

— У Курску 26 красавіка з Знаменскаго манастыру прапаў образ Курскай Маткі Божай. Манахі апавесьцілі аб гэтым трывожным звонам у 4 гадз. рана.

— Елецкі «Совнарком» знайшоўшы чыннасьці г. Арла контр-рэвалюцыйнымі, пастанавіў стварыць новую Елецкую губэрн. с паветаў, каторыя цягнуць за Ельцом.

— З Іркуцка паведамляюць ад 26/IV, што «Центросібір» пастанавіла залажыць у Іркуцку Сібірскую Тэлеграфную Агенцыю і Кніжную Палату.

— Смаленскі «Исполком» пастановаю забараніў ўезд у Смаленск. У горадзе, як паведамляе старшыня Смал. областн. Савету Пікель, харчовы крызыс, нізвычайная лічба уцекачоў і бэзработнае. Зарэгістравана больш 5000 безработных сярод каторых усялякія «анархісты» вядуць пагромную агітацыю, ў скутку якой бываюць выпадкі спатычак з войскам.

Земствы і гарадзкія рады ліквідуюцца і далей за 25-26 красавіка. Ліквідованы Грязовецкая і Троіцко-саўская гарадзк. дума, Мензелінскае і Троіцко-саўскае земствы.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Епіскап Гэоргій паедзіць на трэці дзень Вялікадня, 7-го мая у Бабруйск на праслаўленне дня памяці слуцкаго младзенца, св. Гаврыіла (мошчы яго эвакуіраваны туды з Слуцка у 1915 г.). Разам з гэтым Еп. Гэоргій зробіць агляд духоўнаго цэнтру, дзе цяпер пануюць польскія легіены.

Агульнае гадавое сабранне членаў сьв. Мікалаеўскаго епархіяльнаго брацтва, якое адбудзецца 9 мая, апрача бягучых справ, разгледзіць пытанне аб перадачы юбілейнаго дому Беларускай Радзе дзеля культурна-асьветных мэтаў.

Юбілейны дом меўся перайсьці Беларускай Радзе яшчэ некольні дзен таму назад, але гэтаму перашкодзіў інспэктар дух. сэмінарыі Паноў, каторы спачатку *сам-жэ* падняў гэта пытанне, цяпер... спужаўся—нібы то прыход Рады „згубіць" кооперацыю губ. вучыцельскаго саюза, які знаходзіцца у гэтым доме. Дзіўны страх!

Замест пашпартаў канцэлярыя нямецк. ваен. паліцмэйстара мае выдаваць жыхаром месца сьвядэтцтвы, а выежджаючым—пропускі.

Губэрнскае прысутцтвіе і часовыя судзьзі—местовыя і павятовыя пачалі функцыяніраваць ад 1 мая, а інстытут выбраных местовай думай міравых судзей распушчан 28 красавіка.

Паніжэнне цэн на мясныя прадукты, с прычын нормірaукі, пачалося ад 30 красавіка:

Каўбаса зам. 5 р. на $3^1/_2$ р. ф.
Сало » 8 р. » 5 р. »
Целяціна » $2^1/_2$ » $2\text{-}1^1/_2$ р. »

Паралельна з мясной рэформай, забараняецца выпечка хлеба у сябе дома. Цукер пачынаюць выдаваць па бонах у тых крамах, зачынена для хлеба.

Хлеб і мясо у рэстаранах і сталоўках будзе давацца па картачках. Дагэтуль хлеб у гэтых мейсцах даваўся на вагу золата:—кавалачак 1 руб.!

Экономія вагі прымечаецца як паведамляюць пры выдачы хлеба у харчовай крамі пры упраўленні Л. Р. ж. д. На 3-х фун. булцы амаль у кожнаго бывае нідахват ад $^1/_4$ ф. да $^1/_8$ ф.

На вялікдзень адпускаюцца чыноўнікі губэрнскіх установаў,—скарбовай палаты, губэрнскаго прысутцтвія і інш. Праца спыняецца ад серады 1 мая да серады 8 мая.

Хоць у кішэні, пуставато—затое сьвято!

Епіскапская рада, каторая утварылася у Менскай епархіі з уладыкі Гэоргія, сьвяшч. Кульчыцкаго, аднаго дзьякона і аднаго псаломшчыка мае спыніцца у хуткім часе паводлуг пастановаў усерасійскаго царкоўнаго сабору. На яе мейсцы мае быць расшырана компэтэнцыя на выбарных асновах.

Абавязковая пастанова Менскай Местовай Думы.

1. Забараняецца у межах м. Менска прыватным асобам і установам адчыняць пасрэдніцкія канторы па падшуківанню працы.

2. Усе істнуючыя такога роду канторы зачыняюцца у працягу двух месяцоў з дня апавешчання гэтай абавязковай пастановы.

УВАГА: Такія жа грамадзянскія установы, ні маючыя прыбытку за пасрэдніцкую працу, могуць хадатайствоваць перад Думай аб іх ніспынены і далей гэтаго сроку.

3. Гэтая абавязковая пастанова уходзіць у моц з дня яе апавешчання.

Ні выпаўняючыя гэтай абавязковай пастановы будуць мець кару па ст. 29. Уст. о Мір. Суд.

Меставы Галава П. Кашчэнко

Афіцыяльнае паведамленне нямецкага вярхоў[illegible] камандавання за 3 мая 1918 року.

Група арміяў Кронпрынца Рупрэхта і Нямецкаго Кронпр[illegible]

На палях бітвы палажэнне ні зьменьваецца. Ар[illegible]рыйскі бой умацаваўся на вучастку Кеммельбергер, а [illegible] сама між Соммаю і Люс-Бахам, каля Мондідзье, Лас[illegible] А болей баявая дзейнасьць абмежоўвалася разьведкаю.

Група арміяў гэрцога Альбрэхта.

На лётарынгском фронці французская артылерыя [illegible]зала дзейнасьць ў пасьляпалудзенны час. Слабыя атакі прыяцеля былі адбіты.

УСХОД. Украіна. Мы скруцілі варожую працiўна[illegible] каля Сэвастополю. Горад забраны намі 1 мая без бою.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф**

Загадчык аддзелу Працы *Г. Я. Арэнсон.*
Пісар П. *В. Андрэяу.*

Беларуская каленія працы для дзяцей беларусаў арганізуецца Школьнай Радай Беларускай школы № 28 на Камароўцы, Залатагорская, 2.

Пад каленію зняты дом і зямля на так званай архіерэйскай дачы. Дзеці будуць самі абрабляць зямлю пад кіраўніцтвам вучыцельніц. Хадатайствуюць перад Местовай Думай аб асыгнаванні грошай для каленіі.

Школьная Рада зьвертаецца да усіх установаў і прыватных асобаў з гарачай прозьбай аб помачы грашыма, інвэнтаром і насеннямі дзеля гэтай добрай справы.

Усе ахвяры просімо перадаваць па адрэсі: Залатагорская, 2, Глаўнай Кіраўнічай па арганізацыі каленіі Александры Меліноўскай.

Ад'езд кс. Рурка, замясьціцеля кіраўнічаго менскай Р.-К. епархіей, на два тыдні у Вільню і Коўно мае зьвязь с пытаннем аб разбору духоўна-адміністратыўнаго раздзелу нікаторых сумежных прыходаў паміж двума епархіямі—Менскай і Віленскай.

Дзеля уладжывання хлебных мытарстваў ад учарашняго дня н. с. ад 2-го мая. пачата проба выдачы хлебнаго пайка кожнаю крамаю (70) і коопэратывам (30) абывацелям самаго блізкаго кварталу. [illegible]

Можа быць паменьшаюць хвасты с сваімі мукамі, можа быць!

Сарод украінцаў тутэйшых спрадвечных жыхароў (каля 430) скранута пытанне аб уладжыванні свайго уласнаго коопэратыва, дзеля гэтай мэты хадатайствуюць перад нямецкай уладай аб дазволу дастаўкі з Украіны двох вагонаў з рознымі прадуктамі.

З гутарні прэдстаўніка [illegible] Каміт. служ. Л. Р. ж. д. Рос[illegible] с праезджаўшым нідаўна [illegible] Менск расійскім пасланік[illegible] Бэрліне Іоффэ аб тым, ці е[illegible] нацыянальны праступак [illegible] стараны жалезнадарожн[illegible] быць на сваім пасту у ак[illegible]ваных мейсцах і атрымлі[illegible] пэнсыю з нямецкай ска[illegible]цы, выявілося, што у г[illegible] німа ніякога „нацыянальн[illegible] праступку".

Беларускі Тэатр:

У нядзелю 5 мая 1918 [illegible] 1-ай гадз. дня дарэмна [illegible] вучняў беларускіх школ і [illegible] дзяцей беларусаў—*Пашы[illegible] у дурні.* камэдыя у 3 д[illegible] Крапіўніцкаго. веч. *Цетка [illegible]вата*, фарс у 3 дзеях. Па[illegible] спэктаклю скокі.

У панядзелак 6 мая *Ха[illegible]* Оржэшко.

У аўторак 7 мая—*Раск[illegible]нае гняздо* Я. Купалы.

У сераду 8 мая—1. *Паўлі[illegible]* камэдыя Я. Купалы. 2. *Мі[illegible]ка*—жарт у 1 дзеі.

Цэны мейсцаў ад 5 р. [illegible] р., с правамі на скокі.

Кіраўнік грэжысэр Ф. Я[illegible]новіч.

Курсы беларусазнаўства.

3 Мая Лекцыя Ст. Лян[illegible]скаго: «Гісторыя Беларус[illegible] права». Пачатак а 7 гадз[illegible]

Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтва Т-ва «Заранка»

Згублен атэстат аб аканчанні Радашк[illegible]скаго Гарадзкого вучы[illegible]шча, выданы на ім[illegible] **Янкі БЭКІША** лічыць нідзейсьцьвітельны[illegible]

Абавязковая пастанова Менскаі Местовай Думы.

I. Гандэль ва усіх крамах і магазынах места Мен[illegible] павінен трываць ад 9—гад. раніцы да—7 гад. вечару.

Увага: На рынках і у крамах, якія таргуюць спаж[illegible]намі таварамі, а такжа у мясных і малочных крамах г[illegible]дэль трывае ад 8—гад. раніцы да 6—гад. вечару.

II. Палудчевная перэрва устанаўляецца ад 2-і да [illegible] гадзіны пасьля палудня.

III. У час палудневаі перэрвы усе гандлевыя устан[illegible] павінны быць зачынены.

IV. Часы гандлю у установах, якія таргуюць „прох[illegible]дітельными напітками" пастанаўляюцца асобна Гарадз[illegible] Думай.

Гэта абавязковая пастанова уходзіць у моц са дня [illegible] абвяшчэння.

Нівыпаўніўшыя гэтай пастановы нясуць кару, якая [illegible]ложана па ст. 29 Уст. аб Мір. Суд.

30 Красавіка 1918 р.

Галава места **П. Кашэнко.**
Загадчык працоўнаго аддзелу **Г. Арэнсон.**
Пісар **П. В. Андраву.**

Друкарня Я. А. Грыбдата.